# Часцінка вялікай гармоніі

## Сакрэт музычнай дынастыі

**Нясвіжская зямля ўзгадавала ці прыняла пад сваё крыло шмат цікавых творчых людзей, якія зрабілі ўнёсак у развіццё культуры не толькі Нясвіжчыны, але і ўсёй Беларусі, і нават свету. Часцей за ўсё ў такіх выпадках гаворка ідзе пра асобных творцаў, што вылучыліся ў пэўнай галіне мастацтва, і зусім рэдка — пра сем'і, для якіх творчасць з'яўляецца справай агульнай. На Нясвіжчыне такія сем'і ёсць.**



Уладзімір Прыгун і яго жонка Тамара — людзі ў нашым раёне вядомыя. Мабыць, няма ніводнага сталага чалавека, які б не ведаў гэтую цудоўную сям'ю, не пабываў бы, хоць аднойчы, на канцэрце з удзелам самаадданых музыкаў. Нядаўна яны сустракаліся з чытачамі Нясвіжскай раённай бібліятэкі. І тое, што прыйшлі туды людзі розных узростаў — ад вучняў старэйшых класаў Нясвіжскай беларускай гімназіі да наведвальнікаў гасцёўні "Ясь і Яніна", што дзейнічае пры бібліятэцы, — людзей пенсійнага ўзросту, гаворыць пра шырокую цікавасць да творчасці мужа і жонкі Прыгуноў.

Тамара Міхайлаўна — карэнная несвіжанка, прадстаўніца добра вядомай тут музычнай дынастыі Гурыных, — свае здольнасці пераняла ад бацькоў. Маці, Ірына Вікенцьеўна, мае цудоўны голас і спявае ў царкоўным хоры, тата, Міхаіл Канстанцінавіч, быў выкладчыкам Нясвіжскай музычнай школы, акампаніятарам знакамітага Лявонавіцкага хору і народнага хору Цэнтральнай раённай бальніцы. Першыя ўрокі ігры на баяне Тамара і яе брат Уладзімір, цяпер выкладчык Нясвіжскай школы мастацтваў, атрымалі ад бацькі. І ўжо не маглі ўявіць, што ёсць недзе іншы свет, у якім не пануюць чароўныя мелодыі іх дзяцінства.

Потым Тамара паступіла ў Мінскае музычнае вучылішча імя М. Глінкі. Далей — кансерваторыя, дзе вучылася ў такіх кампетэнтных педагогаў, як Міхаіл Солапаў, Леанід Азарэвіч ды іншыя.

Яе першае месца працы — мінская 10-я музычная школа, куды Тамара прыйшла выкладчыкам па класе баяна і акардэона. Праз нейкі час запрасілі маладую настаўніцу на пасаду намесніка дырэктара па харэаграфіі ў 125-ю харэаграфічную школу. Адначасова працавала ў Ждановіцкім аздараўленчым цэнтры для дзяцей з чарнобыльскай зоны. Тут працаваў і яе муж, Уладзімір Прыгун, падпалкоўнік у адстаўцы.

Уладзімір Уладзіміравіч родам з Віцебска. Закончыў Мінскае музычнае вучылішча імя М. Глінкі па класе трубы, інстытут культуры (цяпер БДУ культуры і мастацтваў). Працаваў начальнікам курса Акадэміі МУС Беларусі, граў у аркестры Міністэрства ўнутраных спраў.

У 1996 годзе Тамару Міхайлаўну напаткала вялікая страта — памёр бацька. Каб не пакідаць маці без падтрымкі, Тамара Міхайлаўна і Уладзімір Уладзіміравіч пераязджаюць у Нясвіж. Тамара Прыгун становіцца пераемніцай справы бацькі, уладкоўваецца на працу ў Нясвіжскую музычную школу, бярэ на сябе кіраўніцтва народным ансамблем "Ліра", які дзейнічае пры Нясвіжскай цэнтральнай раённай бальніцы, сноўскага народнага ансамбля песні і танца "Вяночак". Арганізуе вакальную групу "Гармонія", удзельнікі якой — выкладчыкі Нясвіжскай школы мастацтваў. Пры Сноўскім доме культуры з яе лёгкай рукі ствараецца мужчынскі народны ансамбль "Акцэнт", адзін з вакалістаў якога — Уладзімір Прыгун.

А яшчэ Тамара Прыгун стала стваральнікам і кіраўніком дзіцячага інструментальнага ансамбля "Меламаны" пры музычнай школе і вакальнага ансамбля "Пралеска", візітоўкай якога з'яўляецца песня "Пралесачка", напісаная самой кіраўніцай. Выканальніцкае майстэрства гэтых калектываў, якія ўдзельнічалі ў фестывалях не толькі на радзіме, але і ў Германіі, Літве, Польшчы, Расіі, неаднаразова адзначалася на абласным, рэспубліканскім узроўнях. А творчасць ансамбляў "Вяночак" і "Акцэнт" — і на міжнародным.

Што да рэпертуару, дык пераважаюць у ім уласныя песні Тамары Прыгун. Частка з іх, а гэта 39 твораў, увайшла ў песенны зборнік "І льюцца гукі па-над родным краем", выданнем якога апекаваўся старшыня агракамбіната "Сноў" Мікалай Радаман. Наогул, таленавітай аўтаркай створана каля сотні песень. Мяркуе выдаць іх зборнік для дзяцей, і аснова ўжо ёсць: гэта добра вядомыя несвіжанам "Кацяняты", "Новы дзень", "Замок из песка", "Кукла" і многія іншыя, якія з прыемнасцю выконваюць юныя ўдзельнікі ансамбля "Пралеска".

У 2008 годзе Уладзіміра Уладзіміравіча запрасілі на пасаду дырэктара клуба жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Тамара Міхайлаўна стала там мастацкім кіраўніком, арганізавала пры клубе вакальную групу "Элегія". Разам муж і жонка ладзяць цікавыя творчыя вечары, святочныя імпрэзы. Не так даўно ў сценах клуба выступаў вядомы на ўсю Беларусь ансамбль "Чысты голас", кіраўніком якога з'яўляецца Валерый Уладзіміравіч Прыгун. Так што творчыя традыцыі гэтай сям'і працягваюць дзеці і ўнукі. Летась паступіла ў Маладзечанскае музычнае вучылішча імя М. Кл. Агінскага пляменніца Т. Прыгун — Ірына Гурына. Самы малодшы з таленавітай дынастыі — васьмігадовы ўнук Раман Кісялёў, які на конкурсе юных выканаўцаў сярод навучэнцаў агульнаадукацыйных школ Мінска заняў 1-е месца, атрымаў дыплом.

Аднойчы звязаўшы свае лёсы, Уладзімір Уладзіміравіч і Тамара Міхайлаўна ніколі не разлучаюцца. Яны ўжо не ўяўляюць сябе паасобку. Агульныя справы, агульныя памкненні, сумесныя праекты. Яны ўсюды разам: і дома, і на працы, і на адпачынку. Хаця адпачынак у гэтай сям'і своеасаблівы. Гэта канцэрты — пачэсны вынік складанай, але цікавай і змястоўнай дзейнасці.

Дзе ж чэрпаюць гэтыя людзі столькі натхнення, адкуль у іх такая прага да творчасці, да працы? Сакрэт раскрыла Тамара Міхайлаўна. Крыніца натхнення — у вялікай сіле роднай зямлі і той сямейнай гармоніі, якую яны з мужам для сябе стварылі.

І ліецца па-над родным краем чароўная мелодыя іх кахання — часцінка вялікай гармоніі Сусвету.

**Валянціна ШЧАРБАКОВА**
*г. Нясвіж*